ЛІПЕНЬ - СНЕЖАНЬ 2023

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

Звычайна БХК выкарыстоўвае праваабаронча-валошкавы колер у дызайне сваіх публікацый. Але на гэты раз мы абралі колер viva magenta.

Па версіі інстытута колеру Pantone гэта колер 2023 года. Прадстаўнікі Інстытута апісваюць гэты колер як смелы, дасціпны і ўсёабдымны; колер, які вітае кожнага з імкненнем да жыцця.

БХК выкарыстоўвае гэты колер, каб паспрабаваць вярнуць увагу свету да Беларусі, нагадаць, што мы — частка глабальнага працэсу, і бяспека нашай краіны ўплывае на бяспеку ўсяго рэгіёна.

Акрамя таго, viva magenta — гэта ўсё яшчэ варыянт чырвонага колеру. Ён дадаткова сігналізуе, што ў той час, як усе прытаміліся ад тэмы Беларусі, сітуацыя з правамі чалавека тут крытычна пагаршаецца.

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2024

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** 5

**РЭЗЮМЕ** 7

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 10

Пашырэнне легалізацыі сістэмных рэпрэсій (ужо не толькі ў дачыненні да палітычных апанентаў і любых іншадумцаў, але ўвогуле да ўсіх) 10

«Праца» з беларусамі, што з’ехалі пасля 2020: пашырэнне палітычных рэпрэсій 14

Узмацненне сілавога блока як частка інстытуцыяналізацыі рэпрэсіўнай палітыкі 15

Узмацненне мілітарызацыі 17

Сістэмная кампанія па рэфрэймінгу генацыду як маніпуляцыя ў рамках палітыкі памяці 18

Рашэнне пытанняў недахопу грашовых рэсурсаў і адтоку чалавечага капіталу праз парушэнне эканамічных і сацыяльных правоў 19

Змяненне мераў сацыяльнай абароны і прафілактыкі правапарушэнняў у дачыненні да дзяцей, якія ствараюць глебу для рэпрэсіўных дзеянняў 21

Агульны адыход ад прынцыпу фармальнай роўнасці 22

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 23

Узмацненне кантролю ў сувязі з перасячэннем мяжы 23

Узмацненне праследу ў сувязі з наяўнасцю замежнага ВНЖ і іншых падобных дакументаў 24

Дыскрымінацыйныя практыкі і ціск на людзей, якія з’ехалі або збіраюцца з'ехаць за мяжу 25

Барацьба з «беларускім нацыяналізмам» 25

Рэпрэсіўныя практыкі ў сувязі з вывучэннем польскай мовы як частка барацьбы з адтокам абітурыентаў з краіны 26

Узмацненне рэпрэсіўных практык у сувязі з выбарамі* - 2024 27

Усплёск рэпрэсій у дачыненні да людзей, звязаных з дэмакратычнымі сіламі 28

III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР ДАТЫЧНА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ 29

Міжнародная федэрацыя таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца спыніла членства Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа 29

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.[1] Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў.[2] У сувязі з неабгрунтаваным ужыццём сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 годзе і рэпрэсіямі, якія распачаліся ўслед за імі ў сакавіку 2021 г., быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН.[3]

З 2019 года БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертак/ў ацэньваюць змены асобна па кожным праве з каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі[4].

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў[5], канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтай плыні інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, убачыць, куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Таму з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашы экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных зменаў у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** у галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

1 *https://www.ohchr.org/ru/special-procedures/sr-belarus*
2 *https://www.ohchr.org/ru/countries/belarus*
3 *https://www.ohchr.org/ru/hr-bodies/hrc/ohchr-belarus/index*
4 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, які рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications;*
*Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring;*
*Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.by/ru/analytics/44 і інш.*
5 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;
- *правапрымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;
- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Наша аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), яна будзе карысная і для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Аналітыка за 2023 г. прадстаўленая ў 2-х аглядах. Выпуск за студзень-чэрвень 2023 года можна знайсці тут.

У 2024 г. агляд выйдзе тройчы (па выніках кожных чатырох месяцаў). **Вы можаце падпісацца на наш агляд тут.**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЭ

У другім паўгоддзі **фармалізацыя (легалізацыя) супрацьпраўных дзеянняў дзяржавы ўзмацняецца, дадаюцца новыя «пласты» рэпрэсій і парушэнняў правоў чалавека ў больш вузкіх сферах**: рэлігіі, сацыяльных гарантый для асобных катэгорый асоб, умоваў працы, працаўладкавання і знаходжання на пэўных пазіцыях у дзяржаўных органах, правоў нацыянальных меншыняў, вольнага часу, арэнды. Дзяржава працягвае адыходзіць ад фармальнай роўнасці: на нарматыўным узроўні ўсё больш дыскрымінацыйных палажэнняў.

Важна падкрэсліць, што будучы першапачаткова скіраванымі супраць палітычных апанентаў і нязгодных з уладай, **па меры свайго пашырэння, рэпрэсіўныя палажэнні заканадаўства патэнцыйна пачынаюць закранаць кожнага чалавека**.

Якасна змяніліся ўмовы для ціску ў **сферы права на свабоду веравызнання**. У другой палове 2023 года ўлады заканадаўча замацавалі базу для пераследу рэлігійных арганізацый і іх сяброў за нелаяльнасць дзяржаве. Гэта будзе весці да яшчэ большага аб'ёму рэпрэсій у дачыненні да рэлігійных супольнасцяў, якія істотна ўзмацніліся з 2020 года.

Асобна падкрэслім **якасныя змены палітычных рэпрэсій у дачыненні да беларусаў_к, што з'ехалі за мяжу**. Калі раней улады стваралі людзям праблемы толькі на тэрыторыі Беларусі (узбуджэнне крымінальных справаў, арышт маёмасці, ціск на сваякоў), то другое паўгоддзе 2023 г. выразна паказала **намер уладаў як мага больш ускладніць людзям жыццё ў краінах новага пражывання**, зрабіць іх становішча яшчэ больш уразлівым і **паспрабаваць, у рамках сваіх магчымасцяў і юрысдыкцыі, дастаць іх рэпрэсіямі і там** праз злоўжыванне міжнародна-прававымі абавязальніцтвамі, якія тычацца грамадзянства.

Дыскрымінацыйная практыка **абмежавання правоў і пераследу за замежны ВНЖ і іншыя «дакументы замежнай дзяржавы, якія даюць права на льготы і іншыя перавагі» (асабліва за «карту паляка»)** да канца 2023 г. вылучаецца ў самастойны трэнд, які эвалюцыянуе. Апроч узмацнення ціску пры праходжанні мяжы, сітуацыя пагаршаецца па месцы працы і вучобы. З улікам як заканадаўчых мер, так і правапрымяняльнай практыкі, **наяўнасць замежнага ВНЖ паступова выкрышталізоўваецца ў асобную дыскрымінацыйную падставу**, а такім чынам, **часовая юрыдычная сувязь з замежнай дзяржавай - у асобную абараняльную прыкмету**. Бо на сёння ўсе выпадкі пераследу ў сувязі з наяўнасцю ў чалавека такіх дакументаў ужо немагчыма назваць пераследам у сувязі з палітычнымі перакананнямі. Асабліва ўлічваючы, што ў шэрагу сітуацый падставай няроўнага абыходжання з чалавекам, з'яўляецца наяўнасць замежнага ВНЖ нават не ў яго самога, а ў яго сваякоў.

**У цэлым паказальна, што ў шэрагу выпадкаў падставы для пераследу і ціску (як заканадаўча, так і на практыцы) пашыраюцца на статут/дзеянні сваякоў, а не самога чалавека**: заканадаўча пашыранае кола сваякоў, статус якіх уплывае на магчымасць прыняцця на дыпламатычную службу; на практыцы зафіксаваныя выпадкі перашкодаў для прасоўвання па службе з-за наяўнасці «карты паляка» ў дзіцяці; а таксама ціску на людзей праз наймальніка, у сувязі з тым, што паўналетняе дзіця рабіла апастыль.

Можна казаць, што ўлады ўсё больш актыўна адыходзяць ад базавага прынцыпу індывідуальнай адказнасці і звяртаюцца да мадэлі калектыўнай адказнасці. У другім паўгоддзі 2023 г. выразна праяўляецца **спроба ўладаў вырашыць праблемы адтоку чалавечага капіталу і недахопу грашовых рэсурсаў з дапамогай мер, якія вядуць да парушэнняў эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.** На ўзроўні агульнай палітыкі/заканадаўчых мер гэта яскрава праяўляецца ў абмеркаванні ідэі абавязковай адпрацоўкі для студэнтаў платнай формы навучання (якая -вельмі верагодна - будзе хутка заканадаўча замацаваная), увядзенні новых правілаў навучання ў ардынатуры для медыкаў, істотныя змены ў функцыянаванні таварыстваў уласнікаў жылля (у т.л. абмежаванне іх аўтаноміі). На практыцы гэты трэнд яскрава праяўляецца ў рэпрэсіўных практыках у сувязі з вывучэннем польскай мовы, у тым ліку закрыццё адукацыйных арганізацый (школ/курсаў), якія прадстаўляюць такія паслугі; ціск на іх супрацоўнікаў.

У другім паўгоддзі таксама можна канстатаваць **заканадаўчае ўзмацненне сілавога блока як частку фармалізацыі рэпрэсіўнай палітыкі**. Заканадаўча пашыраюцца паўнамоцтвы КДБ у некалькіх сферах (кантроль за дыпламатамі, ваенная служба і мабілізацыя, прымяненне зброі). Змяняецца падыход да фармулявання функцый і прызначэння знешняй разведкі: скасаваны грамадскія інтарэсы як мэта яе дзейнасці, а таксама з'яўляецца новая задача па элімінацыі пагроз нацыянальнай бяспецы за межамі Беларусі.

Таксама варта адзначыць **інтэнсіўнае ўзмацненне мілітарызацыі**. Уводзіцца новы панятак **«апарат умацавання»**.[6]

**Дзяржаўная кампанія па рэфрэймінгу генацыду, якую мы вылучылі ў асобны трэнд у першым паўгоддзі 2023 г., сістэмна выйшла на ўзровень сярэдняй школьнай адукацыі.** У лістападзе 2023 года былі прадстаўлены 3 новыя падручнікі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для 1-4, 5-9, 10-11 класаў. Наратывы, якія распальваюць варожасць у дачыненні да беларусаў, нязгодных з уладай, і шырыня ахопу (усе школы краіны) у сукупнасці могуць пацягнуць доўгатэрміновыя негатыўныя сацыяльныя наступствы.

[6] *Грамадзяне, якія прыцягваюцца для аказання дапамогі ваенным камісарыятам і КДБ у правядзенні абвяшчэння, прызыву і адпраўкі (пастаўкі) мабілізацыйных рэсурсаў ва Ўзброеныя Сілы.*

Набывае **новае вымярэнне і барацьба ўладаў з беларускай культурай, якую ўлады называюць барацьбой з «беларускім нацыяналізмам».** У другім паўгоддзі 2023 г. упершыню за гісторыю незалежнай Беларусі з-за негатыўнага стаўлення да імперскай расійскай палітыкі ў дачыненні да беларусаў са школьнай праграмы выключаны твор беларускай літаратурнай класікі «Каласы пад сярпом тваім» (Уладзімір Караткевіч), а некалькі твораў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча прызнаныя «экстрэмісцкімі».

Такім чынам, працягваецца палітыка дыскрэдытацыі адрознай ад праўладнай сістэмы каштоўнасцяў па двух кірунках: «антызаходніцтва» і ачарненне беларускага нацыянальнага кампанента з прыярытэтызацыяй расійскіх каланіяльных наратываў. **«Антызаходніцтва» пры гэтым пачынае рухацца ў бок формаў часоў «жалезнай заслоны» ў СССР** (з'явіліся заканадаўчыя патрабаванні паведамляць аб арэндзе жылля замежнікамі, павышаную ўвагу да людзей, якія збіраюцца выехаць за мяжу на вучобу або працу, ціск у сувязі з гэтым).

Таксама асобна важна зафіксаваць узмацненне рэпрэсій у сувязі з пачаткам выбарчай кампаніі 2024 г. у Беларусі.

Акрамя гэтага, набывае доўгатэрміновы і ўстойлівы характар практыка ўтрымання ва ўмовах «*incommunicado*» шэрагу публічных палітвязняў - апанентак_ў рэжыму.

У кантэксце рэакцый міжнародных структур на сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі асноўным якасным змяненнем і істотным крокам стала рашэнне Міжнароднай федэрацыі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца прыпыніць членства БТЧК у федэрацыі.

# I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- фармалізацыя рэпрэсій выходзіць на больш сістэмны і масавы ўзровень, патэнцыйна закранаючы, у сілу пашырэння сфер, наогул усіх людзей, а не толькі нязгодных з уладай. Пры гэтым якасна змяніўся ціск у дачыненні да тых, хто з'ехаў: дзяржава спрабуе «выносіць» рэпрэсіі за межы сваёй тэрыторыі;
- заканадаўчае ўзмацненне сілавога блока (пашырэнне паўнамоцтваў КДБ, змяненне прызначэння і функцый знешняй разведкі);
- інтэнсіфікацыя спроб уладаў вырашыць праблемы адтоку чалавечага капіталу і недахопу грашовых рэсурсаў з дапамогай мер, якія вядуць да парушэння эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.

## ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ (УЖО НЕ ТОЛЬКІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ПАЛІТЫЧНЫХ АПАНЕНТАЎ І ЛЮБЫХ ІНШАДУМЦАЎ, АЛЕ ЎВОГУЛЕ ЎСІХ)

Усё больш інтэнсіўна на заканадаўчым узроўні замацоўваюцца фармальныя падставы для сістэмных і масавых палітычных рэпрэсій. Прычым, калі ў першым паўгоддзі 2023 г. гэта тычылася больш агульных сфер, звязаных з грамадзянствам, уездам/выездам з краіны, крымінальнай адказнасцю, то ў другім паўгоддзі легалізацыя спускаецца на ўзровень больш вузкіх сфер, якія закранаюць штодзённае жыццё чалавека, дадаючы дадатковыя пласты рэпрэсій. У тым ліку, закранаючы сферу рэлігіі, вольнага часу, арэнды, прэферэнцый асобным

катэгорыям асоб, работы, працаўладкавання і знаходжання на пэўных пазіцыях у дзяржаўных органах, нацыянальных мяншыняў. **Будучы накіраванымі супраць палітычных апанентаў і нязгодных з уладай, па меры свайго «распылення» па заканадаўстве, рэпрэсіўныя палажэнні ўсё больш могуць патэнцыйна закранаць кожнага чалавека**.

**1.** За другую палову года былі прыняты змены ў два важныя законы, якія ствараюць глебу для сістэмных і масавых дыскрымінацыйных практык і накіраваныя на неправамерныя абмежаванні фундаментальных правоў і канстытуцыйных гарантый, **якія датычаць функцыянавання інстытутаў грамадзянскай супольнасці.**

У лістападзе 2023 года ў другім чытанні прыняты праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб змене законаў па пытаннях дзейнасці рэлігійных арганізацый»,[7] які прадугледжвае **унясенне паправак у закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях»**. Новыя нормы істотна абмяжоўваюць свабоду сумлення і рэлігіі і фактычна замацоўваюць забарону для рэлігійных арганізацый быць нелаяльнымі да дзейнай улады. У тым ліку забараняецца займацца дзейнасцю, накіраванай «супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды», «палітычнай дзейнасцю», удзельнічаць у працы палітычных партый. Абавязковая перарэгістрацыя рэлігійных арганізацый пасля прыняцця змен.[8] Па сутнасці, яны фармалізуюць рэпрэсіўную практыку ў дачыненні да рэлігійных супольнасцяў[9] і іх сяброў, якая істотна ўзмацнілася з 2020 года[10].

У кастрычніку набылі моц **змены ў закон «Аб сродках масавай інфармацыі»**[11]. Асноўная навацыя - уводзіцца механізм прыняцця сіметрычных мер у дачыненні да замежных СМІ, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у выпадку пацверджання недружалюбных дзеянняў замежных дзяржаў у адносінах да нацыянальных СМІ[12]. Гэта супярэчыць праву на доступ да інфармацыі і свабодзе слова і таксама з'яўляецца праявай палітыкі «антызаходніцтва».

---

7 *https://house.gov.by/ru/zakony-ru/view/ob-izmenenii-zakonov-po-voprosam-dejatelnosti-religioznyx-organizatsij-1530/*

8 *Падрабязны аналіз зменаў Закона, якія парушаюць свабоду перакананняў і рэлігіі, гл. тут: https://belarus2020.churchby.info/forum-18-belarus-repressivnyj-zakonoproekt-o-religii-ozhidaet-vtorogo-chteniya-chast-2/.*

9 *Рэпрэсіі тычацца розных грамадаў. Разам з тым колькасна больш за ўсіх рэпрэсіям падвяргаюцца святары каталіцкай царквы. Паводле справаздачы за 2023 год міжнароднай каталіцкай дабрачыннай арганізацыі «Kirche in Not», Беларусь (разам з Нікарагуа) займаюць першыя пазіцыі па пераследу каталіцкіх святароў у рамках палітычных рэпрэсій: https://acninternational.org/dozens-of-priests-arrested-in-2023-as-authoritarian-regimes-crack-down-on-church/*

10 *Беларускія святары, паддадзеныя пераследу, Хрысціянская візія: https://belarus2020.churchby.info/persecuted-priests-belarus-ru/*

11 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300274 (змены),*
*https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=h10800427 (тэкст Закону са зменамі)*

12 *https://pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v-oblasti-prava/2023/october/75586/*

**2.** У ліпені набылі моц змены ў **закон « Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь»**,[13] якія могуць стаць перашкодай для рэалізацыі **правоў нацыянальных мяншыняў.** Скасавана магчымасць ствараць асобныя школы ці дашкольныя ўстановы з выхаваннем і навучаннем на мове меншасці. Засталася магчымасць толькі стварэння асобных класаў ці груп для вывучэння мовы і літаратуры нацыянальнай меншасці. Акрамя таго, калі раней для іх стварэння патрабавалася толькі згода мясцовых уладаў, зараз гэта павінна быць узгоднена з Міністэрствам адукацыі.

3. Зменены шэраг палажэнняў, які датычыцца **умоваў працы, працаўладкавання і сацыяльных гарантый для асобных катэгорый людзей**. Гэтыя змены ствараюць дадатковыя ўмовы для дыскрымінацыйных практык і парушаюць шэраг правоў і свабод.

**Па-першае**, асаблівая ўвага ўдзелена крытэрыям для працаўладкавання ў розных сферах дзяржаўнай службы і ў прынцыпе працы ў дзяржаўных органах. Пры гэтым асобныя палажэнні закранаюць не толькі самога чалавека, але і яго сваякоў, ставячы чалавека ў залежнасць ад іх магчымых статусаў.

**а**. У жніўні зацверджаная **новая рэдакцыя Палажэння аб праходжанні службы ў органах пракуратуры Рэспублікі Беларусь**.[14] Цяпер чалавек не можа быць прыняты на службу ў органы пракуратуры, калі мае дакументы замежных дзяржаў, якія прадстаўляюць правы на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю, а таксама карыстаецца такімі льготамі і перавагамі.[15]

**б**. У верасні Пастановай урада зацверджанае **Палажэнне аб арганізацыі праверкі звестак аб кандыдатах на асобныя пасады служачых, якія не з'яўляюцца дзяржаўнымі грамадзянскімі пасадамі**.[16] Людзей, якія прэтэндуюць на заняцце гэтых пасад, будуць правяраць на наяўнасць судзімасцяў (прычым нават знятых або пагашаных), здзяйсненне дзеянняў, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь (што сёння выкарыстоўваецца як адно з агульных рэпрэсіўных палажэнняў крымінальнага заканадаўства). Акрамя гэтага, будуць правяраць ці не звяртаўся чалавек у падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі

13 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300300*

14 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32300271*

15 *Такая фармулёўка па сэнсе ахоплівае ўсе дакументы, з дапамогай якіх у наш час легалізуюцца ў іншых краінах беларусы, змушаныя з'ехаць з-за пераследу пасля 2020 г.*

16 *Дакумент замацоўвае асаблівыя патрабаванні да праверкі кандыдатаў на пасады тэхнічных работнікаў дзяржаўных органаў, работнікаў апаратаў арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь; работнікаў апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей; кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў, кіраўнікоў кадравых службаў арганізацый з дзяржаўнай формай уласнасці, кіраўнікоў абласных саюзаў спажывецкіх таварыстваў, абласных спажывецкіх таварыстваў: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300612;*

па пытаннях выезду за мяжу, а таксама да замежных дзяржаваў па атрыманне грамадзянства або віду на жыхарства ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі ці нацыянальнай прыналежнасцю.

Не вельмі зразумела, як можна праверыць факт звароту ў органы замежных дзяржаў, але хутчэй за ўсё гэтае палажэнне дадасць падставаў для дадатковага масіву пераследу за факт наяўнасці замежнага ВНЖ ці іншых падобных дакументаў.

**в**. У кастрычніку былі ўнесеныя **змены ў Палажэнне аб дыпламатычнай службе**, больш жорсткія правілы прыёму на дыпламатычную службу і істотна пашыраюць кола людзей, звязаных з чалавекам, статус якіх можа перашкаджаць яго прыёму на працу. Цяпер чалавек не можа быць прыняты на дыпламатычную службу ў выпадку наяўнасці ў яго мужа/жонкі не толькі грамадзянства замежнай дзяржавы (як раней), але і віду на жыхарства іншай дзяржавы або іншага дакумента, які дае права на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю. Больш за тое, у выпадку наяўнасці такіх дакументаў у блізкіх сваякоў[17], а таксама пасынкаў і падчарыц дыпламатаў пытанне аб мэтазгоднасці знаходжання іх на службе ўпаўнаважаны вырашаць КДБ.[18]

**Па-другое**, у ліпені Міністэрства спорту і турызму зацвердзіла **прафесійныя і этычныя патрабаванні да экскурсаводаў і гідам-перакладчыкаў**.[19] Апроч іншага там утрымоўваецца шэраг ідэалагізаваных палажэнняў, якія супярэчаць, у прыватнасці, свабодзе выказвання меркавання, свабодзе творчасці, якія прадугледжваюць цэнзуру ў дзейнасці гідаў і экскурсаводаў і прымушаюць саміх экскурсаводаў цэнзураваць турыстаў.[20]

**Па-трэцяе**, у снежні Урад зацвердзіў **новае Палажэнне аб пенсіях за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь**.[21] З'явіліся новыя падставы для адмовы ва ўсталяванні такой пенсіі, а таксама для спынення ўжо ўсталяванай: непаважлівае

[17] *Згодна з Палажэннем гэта бацькі, дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя/удачараваныя), родныя браты і сёстры. Раней браты і сёстры не ўлічваліся.*

[18] *У папярэдняй версіі Палажэння факт наяўнасці толькі замежнага грамадзянства (а не ВНЖ) у мужа і жонкі, дзяцей і бацькоў, якія сумесна пражываюць, толькі мог быць перашкаджальнай акалічнасцю да паступлення на службу. Пытанне вырашаў Міністр замежных спраў пасля запыту меркавання ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа па абароне дзяржаўных сакрэтаў. Апроч гэтага ў новай рэдакцыі скасаваная агаворка аб «сумесна пражываючых».*

[19] *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340219*

[20] *Напрыклад: экскурсаводы і гіды-перакладчыкі павінны «праяўляць павагу да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці», «не дапускаць пры правядзенні экскурсій суб'ектыўных некарэктных ацэнак і выказванняў аб Рэспубліцы Беларусь і іншых дзяржавах», «выключаць любыя формы правакацыі ў адзенні і знешнім выглядзе». Акрамя гэтага, экскурсаводы і гіды павінны "прымаць меры па недапушчэнні з боку турыстаў, экскурсантаў ці іншых асоб некарэктных, правакацыйных і іншых негатыўных выказванняў або дзеянняў.*

[21] *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300865*

стаўленне да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні «супраць парадку кіравання, грамадскага парадку». У гэтай меры таксама відавочна прагледжваецца насаджэнне самацэнзуры ў дачыненні да любога выказвання нелаяльнасці да ўлады з боку буйных чыноўнікаў, заслужаных людзей з розных сфер, нават тых, хто пакінуў сістэму.

**4**. У першым чытанні прынятыя **змены ў Закон "Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь" і Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях**. Людзі (як юрыдычныя, так і фізічныя асобы) будуць абавязаныя інфармаваць МУС аб здачы ў арэнду жылля замежнікам.[22] У тым ліку грамадзянам тых краін, якім па заканадаўстве можна не дэклараваць на працягу вызначанага тэрміна сваё месца жыхарства пры знаходжанні ў Беларусі.[23] За непаведамленне плануецца ўвесці адміністрацыйную адказнасць. Характэрна, што пачаўшы разглядаць гэтыя змены як асобны законапраект, у выніку Палата прадстаўнікоў зрабіла іх часткай праекту закона »Аб змене законаў па пытаннях забеспячэння нацыянальнай бяспекі".[24]

## «ПРАЦА» З БЕЛАРУСАМІ, ШТО З'ЕХАЛІ ПАСЛЯ 2020: ПАШЫРЭННЕ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭПРЭСІЙ

У другім паўгоддзі адбыўся якасна новы вiток пашырэння палітычных рэпрэсій у адносінах да тых, хто з'ехаў. Раней улады стваралі людзям праблемы на тэрыторыі Беларусі (узбуджэнне крымінальных спраў, арышт маёмасці, ціск на сваякоў), фармалісцкі спрабуючы прыцягнуць людзей назад праз «Камісію па вяртанні» (праца якой таксама носіць рэпрэсіўны характар). Другое паўгоддзе 2023 г. выразна **паказала намер уладаў як мага больш ускладніць людзям жыццё ў краінах новага пражывання, зрабіць іх становішча яшчэ больш уразлівым і паспрабаваць, у рамках сваіх магчымасцяў і юрысдыкцыі, дастаць іх рэпрэсіямі і там**.

У верасні 2023 г. быў прыняты **Указ № 278 «Аб парадку выдачы дакументаў і здзяйснення дзеянняў»**. Па-першае, шэраг адміністрацыйных працэдур цяпер можна будзе здзейсніць толькі ў Беларусі асабіста або па даверанасці, якая аформлена ў Беларусі (у тым ліку і здзелкі з маёмасцю). Па-другое, атрымаць і абмяняць звычайны пашпарт, ID і біяметрычны пашпарт можна будзе толькі

[22] *https://t.me/housegovby/14004*
[23] *Згодна з заканадаўствам ад рэгістрацыі на працягу 30 сутак вызваленыя грамадзяне Казахстана, Літвы, Латвіі, ААЭ, Украіны і Эстоніі, а на працягу 90 сутак - грамадзяне Расіі..*
[24] *https://house.gov.by/ru/zakony-ru/view/ob-izmenenii-zakonov-po-voprosam-prebyvanija-inostrantsev-na-territorii-respubliki-belarus-1566/*

ў Беларусі, нават грамадзянам Беларусі, якія маюць пашпарты серыі PP (гэта значыць афармілі пастаяннае пражыванне ў іншай краіне).

Указ парушае шэраг правоў чалавека і можа ствараць перашкоды для рэалізацыі іншых правоў і канстытуцыйных гарантый: права на роўнае абыходжанне (недыскрымінацыя); права на свабоднае перамяшчэнне; права на неўмяшанне ў асабістае, сямейнае жыццё; права браць шлюб і засноўваць сям'ю; права кожнага дзіцяці на рэгістрацыю і набыццё грамадзянства); права ўласнасці.[25] Відавочна, што прынятыя заканадаўчыя меры накіраваныя менавіта на абмежаванні ў правах вымушаных палітычных эмігрантаў. Пра гэта сведчаць, у тым ліку, і выказванні дзяржаўных актораў (уключаючы прапановы «зрабіць паслабленні для патрыятычна настроеных суайчыннікаў за мяжой»[26]). Разам з тым, рэальныя наступствы прыняцця гэтага ўказа вельмі шырокія, бо ён закранае ў прынцыпе ўсіх грамадзян Беларусі, якія жывуць за мяжой незалежна ад палітычных поглядаў і/або ўдзелу ў пратэстах у сувязі з падзеямі 2020 года.

Адзначым, што праз гэты Указ ва ўдзел у рэпрэсіях уцягваецца ўсё больш і больш дзяржаўных інстытутаў і служачых (у дадзеным выпадку супрацоўнікаў дыпламатычных і консульскіх установаў), якія выконваюць супрацьпраўныя (няхай і фармалізаваныя) указанні.

## УЗМАЦНЕННЕ СІЛАВОГА БЛОКА ЯК ЧАСТКА ІНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ РЭПРЭСІЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

У асобны трэнд варта вылучыць фармалізацыю ўзмацнення сілавога блока. **Па-першае, фармалізаванае пашырэнне паўнамоцтваў КДБ у некалькіх сферах**:

**а.** Пашыраюцца заканадаўчыя рамкі для непрапарцыйнага прымянення сілы пад маркай «барацьбы з тэрарызмам». У снежні адразу ў двух чытаннях прыняты папраўкі ў законы аб барацьбе з тэрарызмам.[27] Адна са зменаў **пашырае магчымасці прымянення зброі супрацоўнікамі КДБ**. У прыватнасці супрацоўнік КДБ можа прымяняць зброю пры значнай колькасці грамадзян, а таксама ў напрамку складоў з вогненебяспечнымі і моцнадзейнымі атрутнымі рэчывы, і сродкаў перавозкі гэтых рэчываў.[28] Гэта можа весці да павелічэння выпадкаў

[25] *БХК рабіў разгорнуты аналіз яго палажэнняў на прадмет адпаведнасці міжнародным стандартам правоў чалавека і палажэнням Канстытуцыі Беларусі: https://belhelcom.org/ru/document/analiz-narusheniy-respublikoy-belarus-mezhdunarodnyh-obyazatelstv-po-pravam-cheloveka-i*

[26] *https://www.youtube.com/watch?v=tUzhvyTiwoo*

[27] *https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2023098001*

[28] *У адпаведнасьці з папярэдняй вэрсіяй закону ў гэтых сытуацыях прымяняць зброю было забаронена. Акрамя гэтага, апошняя падстава для немагчымасці прымянення зброі (у дачыненні да жанчын, асоб з інваліднасцю і непаўналетніх) перафармуляваная. Цяпер выключэннем з гэтага становішча з'яўляецца не толькі ўчыненне гэтымі групамі грамадзян узброенага нападу, які можа пагражаць жыццю і здароўю іншых людзей, але і іх узброены супраціў*

адвольнага пазбаўлення жыцця. У цэлым, гэта дадатковае фармалізаванае зняцце тармазоў у супрацоўнікаў КДБ, якое, у тым ліку, уплывае і на ўзмацненне атмасферы страху сярод людзей.

**б. Пашыраныя паўнамоцтвы КДБ па кантролі дыпламатычных работнікаў**. Як ужо адзначалася вышэй, у кастрычніку былі ўнесены змяненні ў Палажэнне аб дыпламатычнай службе. Цяпер пытанні аб мэтазгоднасці знаходжання на службе людзей, у якіх сваякі маюць замежнае грамадзянства або від на жыхарства, вырашае КДБ. Раней гэта знаходзілася ў кампетэнцыі міністра замежных справаў пасля запыту меркавання ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа па абароне дзяржаўных сакрэтаў.

**в. Пашыраны паўнамоцтвы КДБ у сферы ваеннай службы і мабілізацыі**. Згодна з папраўкамі ў законы «Аб воінскім абавязку і ваеннай службе» і «Аб мабілізацыйнай падрыхтоўцы і мабілізацыі», прынятых у першым чытанні[29] супрацоўнікі КДБ, у тым ліку, надзяляюцца паўнамоцтвамі складаць пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях за няяўку без уважлівых прычын на мерапрыемствы па прызыве на вайсковую службу. Таксама з'яўляецца магчымасць па хадайніцтве Старшыні КДБ, узгодненым з Мінабароны, здымаць ваеннаабавязаных з воінскага ўліку ў ваенных камісарыятах па месцы жыхарства і накіроўваць для пастаноўкі на воінскі ўлік у абласное ўпраўленне КДБ. Гэта стварае дадатковую крыніцу фармавання кадравай базы КДБ, гэта значыць вядзе да росту колькасці супрацоўнікаў рэпрэсіўных органаў. Апроч гэтага, КДБ цяпер будзе таксама займацца вайсковымі зборамі.[30]

**Па-другое**, **пашыраныя паўнамоцтвы і зменены падыход да фармулявання функцый і прызначэння знешняй разведкі. Гэта дае магчымасць адвольнага і пашыральнага тлумачэння правамернасці яе дзеянняў і касуе інтарэсы грамадства як мэту яе дзейнасці**. У лістападзе ўнесены змяненні ва ўказ «Аб пытаннях знешняй разведкі».[31] Зменена прызначэнне знешняй разведкі: з «абароны жыццёва важных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы» на «абарону нацыянальных інтарэсаў». Таксама дададзена палажэнне аб яе галоўнай мэце (якога раней не было): выключэнне раптоўнасці ўзнікнення **за межамі** Рэспублікі Беларусь **пагроз нацыянальнай бяспекі.** Пры гэтым таксама з'яўляецца новая задача: рэалізацыя папераджальных мер па недапушчэнні ўрону нацыянальным інтарэсам і бяспецы Рэспублікі Беларусь з боку спецыяльных службаў і арганізацый замежных дзяржаў, тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацый, арганізаваных злачынных груп і асобных асоб.

---

29 *https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2023080001*
30 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300525*
31 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32300344*

У сукупнасці са зменамі ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, унесенымі ў першай палове 2023 года,[32] у тым ліку магчымасці аднясення канкрэтнага чалавека да крыніц пагроз нацыянальнай бяспецы, усе гэтыя змены ў рэгуляванні дзейнасці знешняй разведкі ствараюць яшчэ большую глебу для незаконнага абмежавання правоў чалавека і пераследу, у тым ліку і ў дачыненні да беларусаў, якія знаходзяцца за мяжой.

**Па-трэцяе**, Генеральны пракурор агучыў **ініцыятыву па вяртанні да інстытута Галоўнай ваеннай пракуратуры для лепшага кантролю за Узброенымі сіламі.** Паводле слоў генеральнага пракурора А.Шведа, размова ідзе аб стварэнні ўсечанага варыянта, каб ваенныя пракуроры займаліся «выключна наглядам за выкананнем законнасці ў войсках у розныя перыяды часу».[33] Відавочна, што такая мера накіраваная на ўзмацненне кантролю, падтрыманне яшчэ большай залежнасці вайскоўцаў ад дзяржавы, атмасферы ціску ў войску.

## УЗМАЦНЕННЕ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ

Дзяржава працягвае мілітарызавацца (у тым ліку ў кантэксце мабілізацыі).

1. У лістападзе ў першым чытанні былі прыняты істотныя папраўкі адразу ў **3 законы: «Аб абароне», «Аб воінскім абавязку і і воінскай службе», "Аб мабілізацыйнай падрыхтоўцы і мабілізацыі".**

**Па-першае, пашыраюцца магчымасці прызыву** (у тым ліку памяншаецца ўзрост пастаноўкі на воінскі ўлік), змяняецца працэдура паведамлення аб яўцы ў ваенкамат, у тым ліку пры мабілізацыі (з дапамогай СМС паведамлення), практычна выключаецца юрыдычная магчымасць неатрымання позвы. **Па-другое, узмацняецца кантроль за ваеннаабавязанымі** (у тым ліку крымінальная і адміністрацыйная адказнасць за ўхіленне ад прызыву і за незʼяўленне ў ваенкамат). **Па-трэцяе**, па рашэнні А. Лукашэнкі **пашыраюць кола магчымых кантрактнікаў**: на ваенную службу па кантракце можна будзе набіраць людзей любога ўзросту; у дачыненні да якіх ажыццяўляецца крымінальны пераслед; якія адбылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчых установах; якія маюць судзімасць; якія незаконна не прайшлі ваенную службу па прызыве. **Па-чацвёртае**, **устанаўліваецца магчымасць удзелу грамадзян у выкананні работ абароннага характару ў мірны час** (з 16 год).

---

[32] *Правы чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі, стр. 13-14: https://trends.belhelcom.org/storage/reviews/July2023/lietuXn5aPJKZ6zUcXAL.pdf*

[33] *https://www.belta.by/society/view/shved-rasskazal-podrobnosti-o-predlozhenii-sozdat-glavnuju-voennuju-prokuraturu-577295-2023/ ; Справочно: институт военной прокуратуры был упразднен в Беларуси в 2014 году.*

[34] *https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2023080001*

Уводзіцца шэраг новых паняццяў, звязаных з мабілізацыяй, і самае важнае - уводзіцца **новы панятак «апарат узмацнення»** — грамадзяне, якія прыцягваюцца для аказання дапамогі ваенным камісарыятам і КДБ у правядзенні абвяшчэння, прызыву і адпраўкі (пастаўкі) мабілізацыйных рэсурсаў ва Узброеныя Сілы.

2. Удвая павялічаны тэрмін прызыву грамадзян на праверачныя зборы, а таксама частата прызыву.[35]

Усе гэтыя меры ствараюць глебу для ўзмацнення атмасферы ціску, выкарыстання людзей для патрэб улады і ўзмацняюць залежнасць людзей ад дзяржавы. Таксама яны сведчаць аб нарастаючым ва ўладаў страху вайны і аб тым, што дзяржава працягвае пераймаць у сувязі з гэтым расійскія практыкі.

## СІСТЭМНАЯ КАМПАНІЯ ПА РЭФРЭЙМІНГУ[36] ГЕНАЦЫДУ ЯК МАНІПУЛЯЦЫЯ Ў РАМКАХ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ

Набывае новыя вымярэнні і ўсё шырэйшыя ахопы дзяржаўная кампанія па рэфрэймінгу генацыду, якую мы вылучылі ў асобны трэнд у першым паўгоддзі.[37] Асаблівая мэта гэтай кампаніі, на наш погляд, - дыскрэдытаваць іншую сістэму каштоўнасцяў, якой прытрымліваюцца нязгодныя, і саміх нязгодных.

У другім паўгоддзі кампанія сістэмна выйшла на ўзровень сярэдняй школьнай адукацыі. У лістападзе 2023 г. былі **прадстаўлены тры новыя падручнікі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для 1-4, 5-9, 10-11 класаў.[38]**

Ва ўсіх трох падручніках змяшчаецца інфармацыя, якая стварае глебу для распальвання варожасці і нянавісці да нацыянальнай беларускай сімволікі (бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня») і яе носьбітаў. Напрыклад, сцвярджаецца, што «носьбіты гэтай сімволікі актыўна ўдзельнічалі ў забойствах ваеннапалонных і мірнага насельніцтва, рабаваннях на карысць нацысцкай Нямеччыны».[39]

Таксама праводзіцца прамая паралель з мірнымі пратэстамі 2020 года. Людзей, якія ўдзельнічалі ў пратэстах, параўноўваюць з калабарацыяністамі. Паведамляецца, што яны «падзялялі нацысцкія метады» і выкарыстоўвалі «нацысцкі» лозунг «Жыве Беларусь».[40]

---

35 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300525*
36 *Тут і далей «рэфрэймінг» (ад англ. frame-рамка) — па-новаму сфармуляваць сутнасць, укласці іншыя сэнсы.*
37 *Правы чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі. Студзень-чэрвень 2023, с. 12-13: https://trends.belhelcom.org/storage/reviews/July2023/YPgwxOCkfVahLYXrpmyl.pdf*
38 *https://www.belta.by/society/view/v-minske-prezentovali-uchebnye-posobija-rasskazyvajuschie-o-genotside-belorusskogo-naroda-v-gody-vov-599507-2023/*
39 *Падручнік для 1-4 класаў, с. 45: https://www.adu.by/images/2023/10/Genozid-bel-naroda-1-4-klass.pdf*
40 *Падручнік для 10-11 класаў, с. 41: https://www.adu.by/images/2023/10/Genozid-bel-naroda-10-11-klass.pdf*

Гэта можна кваліфікаваць як стварэнне глебы для распальвання нянавісці і варожасці ў дачыненні да тых, хто выкарыстоўвае беларускую нацыянальную і да ўдзельніц_каў мірных пратэстаў 2020 года.

Усё гэта з'яўляецца парушэннем права на адукацыю і культурных правоў дзяцей (бо з дапамогай маніпуляцый матэрыял наўмысна стварае ў іх ілжывыя ўяўленні пра беларускую нацыянальную сімволіку, пры гэтым стыгматызуючы яе).

Як частка палітыкі дзяржавы ў галіне адукацыі, выданне такіх падручнікаў і навучанне па іх дзяцей усіх класаў ва ўсіх школах краіны можа быць кваліфікавана як масавае і грубае парушэнне правоў дзяцей.

Адзначым, што ў кампаніі з'явілася расійскае фінансаванне, верагодна, адсюль — наратывы аб «генацыдзе насельніцтва Беларусі і Расіі» і «генацыдзе савецкага народа».[41]

## РАШЭННЕ ПЫТАННЯЎ НЕДАХОПУ ГРАШОВЫХ РЭСУРСАЎ І АДТОКУ ЧАЛАВЕЧАГА КАПІТАЛУ ПРАЗ ПАРУШЭННЕ ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАВОЎ

У другім паўгоддзі 2023 г. адразу ў некалькіх сферах: адукацыі, працаўладкавання і ўласнасці - было прынята або анансавана прыняцце шэрагу заканадаўчых мер, якія парушаюць сацыяльна-эканамічныя правы і канстытуцыйныя гарантыі. У тым ліку: права на працу, права на адукацыю, права распараджацца сваёй уласнасцю. Гэтыя меры таксама **павялічваюць залежнасць чалавека ад дзяржавы**. Улады не хаваюць, што гэтыя захады (фактычна прымусовага характару) накіраваныя на тое, каб спыніць адток людзей з краіны, які значна вырас пасля пачатку рэпрэсій у 2020 г., а таксама, каб папоўніць бюджэт.

**Па-першае**, асаблівай увагі ў кантэксце вышэйшай адукацыі заслугоўваюць **меры, прынятыя дзяржавай у дачыненні да навучання медыкаў.** Пасля пачатку рэпрэсій у 2020 г. пачаўся значны адток медыцынскіх кадраў з краіны.[42] У кастрычніку былі ўнесеныя папраўкі ў закон «Аб ахове здароўя».[43] Прадугледжваецца шэраг

41 *У лістападзе апублікаваны праект Саюзнай Дзяржавы па стварэнні інфармацыйнага цэнтра ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец» на тэрыторыі былога канцлагера ў Мінску. Часткай экспазіцыі з'яўляюцца фігуры карнікаў з бел-чырвона-белымі павязкамі. Пры гэтым усе фігуры экспазіцыі аднакаляровыя, бел-чырвона-белыя павязкі на руках карнікаў размаляваныя і адразу ж даюць акцэнт: https://www.zdv.by/sobytiya/novosti/proekt-soyuznogo-gosudarstva-memorialnyy-kompleks-trostenec*

42 *https://news.zerkalo.io/economics/22057.html ; https://www.dekoder.org/ru/article/belaya-emigraciya-pochemu-iz-belarusi-uezzhayut-vrachi*

43 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300308*

змен у дачыненні да ардынатуры.[44] Скасаваная опцыя платнага навучання, яна застаецца толькі для замежных грамадзянаў (гэта азначае, цяпер для ўсіх беларусаў будзе абавязковая адпрацоўка па яго заканчэнні), павялічаны і тэрмін навучання, і тэрмін адпрацоўкі, прадугледжваюцца фінансавыя наступствы за спыненне навучання да атрымання дыплома або адмову ад адпрацоўкі (прычым за адмову ад размеркавання - з каэфіцыентам 2,5). Такім чынам, новыя правілы пазбаўляюць медыкаў права выбару месца працы на 7 - 10 гадоў.

**Па-другое**, у канцы снежня прыняты закон «Аб змене законаў па пытаннях кіравання жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі».[45] Ён уносіць істотныя змены ў функцыянаванне таварыстваў уласнікаў (ТУ). Змены, у тым ліку, датычаць збору і распараджэння фінансавымі сродкамі, сабранымі на капітальны рамонт (ТУ не змогуць распараджацца грашыма, сабранымі членамі ТУ на капітальны рамонт), уведзеныя новыя крытэрыі па прызначэнні і зняцці з пасады старшыняў таварыстваў. У цэлым закон накіраваны на **істотнае памяншэнне аўтаноміі ТУ і перавод кіравання ўласнасцю грамадзян дзяржаўным камунальным службам.** Улады не хаваюць таго, што апроч эканамічных меркаванняў гэта наступствы актыўнай пазіцыі, якую займалі шэраг ТУ падчас пратэстаў 2020 г.[46]

**Па-трэцяе**, у верасні міністр адукацыі А. Іванец у кантэксце абмеркавання адтоку выпускнікоў універсітэтаў з краіны выказаў ідэю аб тым, **што абавязковая адпрацоўка (размеркаванне) пасля заканчэння ВНУ павінна быць прадугледжана не толькі для студэнтаў бюджэтнай формы, але і платнай**.[47] Падкрэслім, што абавязковае размеркаванне ў прынцыпе можа лічыцца практыкай прымусовай працы.[48] Размеркаванне людзей, якія навучаліся за кошт бюджэту, супярэчыць магчымасці і сэнсу атрымання на ўмовах конкурсу бясплатнай вышэйшай адукацыі (менавіта гэта дэклараецца дзяржавай). Людзі, якія па якіх-небудзь прычынах не адпрацавалі размеркаванне, абавязаны вярнуць дзяржаве кошт сваёй «бясплатнай» адукацыі. У выпадку ж з размеркаваннем студэнтаў, якія аплацілі сваё навучанне, гэта яшчэ больш абсурдная практыка, бо чалавек, у выпадку прыняцця гэтых змен, будзе вымушаны двойчы аддаваць грошы дзяржаве: у першы раз за навучанне, і ў другі раз, каб пазбегнуць прымянення ў дачыненні да сябе практыкі прымусовай працы. Па словах міністра, **рыхтуюцца адпаведныя змены ў Кодэкс аб адукацыі**.

---

44 *Адна з найвышэйшых форм павышэння прафесійнай падрыхтоўкі ўрачоў-спецыялістаў, якія ўжо адпрацавалі 2 гады размеркавання пасля заканчэння ВНУ.*

45 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300330*

46 *Н. Качанава, каментуючы закон на стадыі праекта, адзначыла: «у 2020 годзе некаторыя таварыствы ўласнікаў павялі сябе неналежным чынам. А вы цяпер разумееце, што б магло быць? Магла б быць вайна. І мы б цяпер не гаварылі пра таварыствы ўласнікаў. І ні пра што болей не гаварылі б. Бо ўсё да гэтага ішло. Таму ўсюды павінен быць парадак і дысцыпліна»: https://news.zerkalo.io/economics/54962.html*

47 *https://citydog.io/post/raspred-studenty-2023/*

48 *Гл. падрабязней Экспертнае заключэнне БХК па пытаннях прымусовай працы ў Рэспубліцы Беларусь: https://belhelcom.org/ru/document/ekspertnoe-zaklyuchenie-po-voprosam-prinuditelnogo-truda-v-respublike-belarus*

**Па-чацвёртае**, у кантэксце абмеркавання кадравага дэфіцыту ў сельскагаспадарчай галіне **разглядаюцца меры, якія фактычна забараняюць звальненне спецыялістаў або кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў без дазволу старшыні райвыканкама**.[49]

## ЗМЯНЕННЕ МЕРАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ І ПРАФІЛАКТЫКІ ПРАВАПАРУШЭННЯЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ СТВАРАЮЦЬ ГЛЕБУ ДЛЯ РЭПРЭСІЎНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

У другім паўгоддзі 2023 г. назіраецца тэндэнцыя ўзмацнення жорсткасці мераў у дачыненні да некаторых уразлівых груп дзяцей. Побач з пазітыўнымі зменамі ў гэтых сферах, шэраг унесеных і прапанаваных у заканадаўства зменаў павышаюць уразлівасць дзяцей, могуць перашкаджаць уліку найважнейшых інтарэсаў дзіцяці, ствараюць глебу для рэпрэсіўнага характару прымянення мер сацыяльнай абароны і прафілактыкі правапарушэнняў.

**Па-першае**, унесеныя змены ў пастанову Савета Міністраў «Аб прызнанні дзяцей, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы» 2019 г.[50] **Зменены пералік паказчыкаў сацыяльна небяспечнага становішча (СНС)**. Цяпер падставай для пастаноўкі сям'і ў СНС можа быць сітуацыя, калі абодва бацькі або адзін з бацькоў больш за тры месяцы не працуюць і (або) неналежна расходуюць розныя сацыяльныя выплаты, з прычыны чаго не задавальняюцца асноўныя жыццёвыя патрэбы дзіцяці (дзяцей). Акрамя гэтага, раней крытэрыем пастаноўкі сям'і ў СНС было прыцягненне дзіцяці старэйшага за 14 гадоў да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці і ўстаноўленыя факты адсутнасці кантролю дзіцяці з боку бацькоў. Цяпер скасаваныя ўзроставыя абмежаванні для дзіцяці, а таксама факт прыцягнення яго да адказнасці. Гэта значыць, падставай могуць стаць дэлінквентныя паводзіны дзіцяці любога ўзросту і распачатая ў дачыненні да яго прафілактычная праца.

**Па-другое**, у першым чытанні прыняты законапраект «Аб змене законаў па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх»[51]. Асноўная негатыўная змена: **змяняюцца ўмовы змяшчэння дзяцей у спецыяльныя выхаваўчыя ўстановы і знаходжання там**. У прыватнасці, цяпер дзіця можна вызначыць у такую ўстанову і без пастановы суда, а па заяве бацькоў або апекуноў,

49 *https://news.zerkalo.io/economics/44577.html*
50 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300856*
51 *https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2023091001*

калі спажыванне такімі дзецьмі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва «ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам». Гэтыя змены відавочна супярэчаць прынцыпам прававой дзяржавы, дзе рашэнні аб абмежаванні правоў павінны прымацца судамі.

## АГУЛЬНЫ АДЫХОД АД ПРЫНЦЫПУ ФАРМАЛЬНАЙ РОЎНАСЦІ

Як мы адзначалі па выніках першага паўгоддзя,[52] пачаўся агульны рух дзяржавы да фармалізацыі дыскрымінацыі. Няроўнасць фармалізуецца або па прыкмеце палітычных поглядаў, або ў кантэксце спажывецкага стаўлення да чалавека і яго «карыснасці» для дзяржавы.

Гэтая тэндэнцыя працягнулася і ў другім паўгоддзі: скасаванне магчымасці адкрыць школы і дашкольныя ўстановы з роднай мовай навучання для нацыянальных меншасцяў; замацаванне наяўнасці замежнага ВНЖ у якасці перашкоды для працаўладкавання на шэраг пасадаў у дзяржаўныя органы, у тым ліку тыя, якія не з'яўляюцца дзяржаўнай службай; пазбаўленне людзей, якія часова і пастаянна пражываюць за мяжой, магчымасці абмяняць пашпарт у дыпламатычных і консульскіх установах, а таксама здзейсніць там шэраг натарыяльных дзеянняў; прыняцце новых правілаў навучання ў ардынатуры для медыкаў (пра што пісалася вышэй).

Важна адзначыць, што як з улікам заканадаўчых мер, так і з улікам правапрымяняльнай практыкі (гл. Раздзел II), наяўнасць замежнага ВНЖ паступова выкрышталізоўваецца ў асобную дыскрымінацыйную падставу, і, такім чынам, статус у замежнай дзяржаве - у асабліва абараняльную прыкмету. На сёння, зыходзячы з усяго комплексу змененых палажэнняў заканадаўства, усе выпадкі пераследу ў сувязі з наяўнасцю такіх дакументаў ужо немагчыма назваць выпадкамі пераследу ў сувязі з палітычнымі поглядамі. Асабліва ўлічваючы, што ў шэрагу сітуацый, падставай (як заканадаўчай, так і практычнай) няроўнага абыходжання з'яўляецца наяўнасць замежнага ВНЖ не ў самога чалавека, а ў яго сваякоў.

---

[52] *Правы чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі, стр.22-23: https://trends.belhelcom.org/storage/reviews/July2023/lietuXn5aPJKZ6zUcXAL.pdf*

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ

ГАЛОЎНАЕ:

- узмацненне практыкі пераследу ў сувязі з наяўнасцю замежнага ВНЖ;
- узмацненне барацьбы з «беларускім нацыяналізмам»;
- узмацненне рэпрэсіўных практык у сувязі з пачаткам выбарчай кампаніі 2024 г. у Беларусі;

## УЗМАЦНЕННЕ КАНТРОЛЮ Ў СУВЯЗІ З ПЕРАСЯЧЭННЕМ МЯЖЫ

Узмацняюцца праверкі ў сувязі з перасячэннем мяжы, і такім чынам, умяшанне ў асабістае жыццё і дыскрымінацыйныя практыкі.

**Па-першае**, **узмацніўся ціск на людзей з замежнымі дакументамі**. Калі ў першым паўгоддзі памежнікі пачалі патрабаваць прад'явіць ВНЖ у замежнай дзяржаве ці іншы падобны дакумент, робячы яго копію, то ў другім паўгоддзі стала вядома аб выпадках прад'яўлення патрабаванняў з боку памежнікаў адмовіцца ад «карты паляка» (у тым ліку проста на мяжы напісаць заяву консулу) пад пагрозамі прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці.[53]

**Па-другое**, у некаторых беларусаў, якія перасякаюць мяжу, **у другім паўгоддзі сталі правяраць IMEI тэлефона**.[54]

**Па-трэцяе**, у жніўні стала вядома, што **некаторых людзей пачалі выклікаць у КДБ пасля перасячэння беларуска-польскай мяжы**. У іх пыталіся пра жыццё ў Польшчы і пра праходжанне польскай мяжы з боку Польшчы.[55]

53 *https://t.me/viasna96/20224*
54 *https://nashaniva.com/323139*
55 *https://nashaniva.com/324055*

# УЗМАЦНЕННЕ ПЕРАСЛЕДУ І СУВЯЗІ З НАЯЎНАСЦЮ ЗАМЕЖНАГА ВНЖ У ІНШЫХ ПАДОБНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

Дыскрымінацыйная практыка пераследу ў сувязі з наяўнасцю замежных дакументаў (асабліва «карты паляка»)[56] да канца 2023 года вылучаецца ў самастойны трэнд, які эвалюцыянуе. Акрамя ўзмацнення ціску пры праходжанні мяжы, апісанага вышэй, сітуацыя пагаршаецца па месцы працы і вучобы.

У першым паўгоддзі супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў прымушалі адмаўляцца ад замежных дакументаў і нават звальнялі ў выпадку адмовы гэта зрабіць.[57] У другім паўгоддзі сталі вядомыя выпадкі, калі ціск аказваўся на чалавека, які яшчэ не мае, а толькі збіраецца падаваць дакументы на атрыманне «карты паляка». Пры гэтым стала таксама вядома, што ў некаторых выпадках пры прасоўванні па службе перашкодай станавілася наяўнасць такога дакумента не ў самога чалавека, а ў яго дзіцяці.[58] Некаторыя людзі, якія працуюць у дзяржаўных установах, адмовіліся ад ідэі атрымліваць такі дакумент з-за страху рэпрэсій.

Таксама ў другім паўгоддзі стала вядома аб паўторных патрабаваннях здаць «карту паляка» на дзяржаўным прадпрыемстве «Гродна-Азот». Дакумент прапаноўвалі аддаць асабіста ў рукі супрацоўніку КДБ.[59]

Такая практыка (як і ў цэлым палітыка) з боку дзяржавы стварае глебу для рэпрэсіўнай «самадзейнасці» ў гэтай сферы. Так у верасні 2023 г. стала вядома, што ў адной з гродзенскіх школ класны кіраўнік папрасіў бацькоў паведаміць, ці ёсць у кагосьці з членаў сям'і «карты паляка» ці ВНЖ іншых краін. Журналістка, назваўшыся мамай школьніка, паразмаўляла з мясцовымі чыноўнікамі, і тыя заявілі, што такіх распараджэнняў ад уладаў не было.[60]

У канцы чэрвеня таксама набыла моц Пастанова МУС і МЗС «Аб прадастаўленні інфармацыі аб дакументах замежнай дзяржавы»,[61] у якім вызначаецца парадак апавяшчэння аб наяўнасці замежнага ВНЖ (згодна з які ўступіў у сілу ў ліпені 2023 г. папраўкам у закон «Аб грамадзянстве»). У лістападзе стала вядома аб практыцы прымянення гэтай нормы. Чалавека не выпусцілі за мяжу, бо ён не падаў даведку з міграцыйнай службы аб тым, што паведаміў аб наяўнасці замежнага ВНЖ.[62] Такім чынам, такое неабгрунтаванае абмежаванне ў сувязі з наяўнасцю замежнага ВНЖ вядзе таксама і да парушэння свабоды перамяшчэння.

---

56 *Адзначым, што паводле перапісу 2019 г. у краіне было 287 693 палякаў.: https://www.belta.by/infographica/view/natsionalnyj-sostav-naselenija-belarusi-22499*

57 *https://nashaniva.com/315859?lang=ru; https://news.zerkalo.io/life/43262.html?c; https://news.zerkalo.io/life/35752.html?utm_source=editorial_block&utm_campaign=recirculation_tut&utm_medium=read_more*

58 *https://nashaniva.com/ru/321656*

59 *https://nashaniva.com/ru/322575*

60 *https://news.zerkalo.io/life/49580.html?c*

61 *https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340276*

62 *https://euroradio.fm/belarusa-yaki-ne-pavedamiu-ab-nayaunasci-vnzh-inshay-krainy-ne-vypuscili-za-myazhu*

# ДЫСКРЫМІНАЦЫЙНЫЯ ПРАКТЫКІ І ЦІСК НА ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ З'ЕХАЛІ АБО ЗБІРАЮЦЦА З'ЕХАЦЬ ЗА МЯЖУ

У ліпені 2023 г. стала вядома аб тым, што ўлады пачалі адсочваць тых, хто атрымлівае апастыль на дакументы (звычайна гэта робіцца для таго, каб дакументы былі валідныя за мяжой). Пры гэтым, у выпадку, пра які стала вядома, на працу даслалі спісы не толькі саміх супрацоўнікаў, але і іх сваякоў (паўналетняга дзіцяці), якія атрымлівалі апастыль. Па гэтых спісах начальства выклікала чалавека на гутарку і прасіла «паразмаўляць з дзіцем».[63]

Пры гэтым у канцы верасня сталі праяўляцца наступствы Указа «Аб парадку выдачы дакументаў і ўчынення дзеянняў», прынятага ў пачатку верасня. Спасылаючыся на гэты ўказ, работнікі навучальных устаноў (вядома пра дзве буйныя ВНУ краіны - БДУ і БДЭУ) адмаўляліся выдаваць па даверанасцях дакументы або дублікаты дакументаў аб адукацыі.[64]

# БАРАЦЬБА З «БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛІЗМАМ»

Дыскрэдытацыя беларускай нацыянальнай культуры і гісторыі на фоне прасоўвання расійскіх наратываў, барацьба з «беларушчынай» як частка рэпрэсіўнай палітыкі ўзмацняецца і набывае новыя формы. У другім паўгоддзі ўлады перайшлі да «чыстак» літаратурных твораў беларускіх класікаў.

**Па-першае**, са школьнай праграмы прыбралі адзін з ключавых раманаў нацыянальнай літаратуры «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, у якім апавядаецца пра станаўленне беларускай нацыі на фоне паўстання Кастуся Каліноўскага 1983 г. супраць імперскай Расіі.[65] Ініцыятарам выступіў прапагандыст і цяперашні дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі В.Гігін, спасылаючыся на тое, што «школьная праграма – гэта фармаванне пэўнай гістарычнай памяці».[66] Акрамя парушэння культурных правоў дзяцей, гэта таксама можна ацаніць як парушэнне права на адукацыю, бо школьная праграма мяняецца без разумных абгрунтаванняў, без уліку інтарэсаў дзяцей і сапраўдных мэт адукацыі, але грунтуючыся толькі на ідэалагічных меркаваннях.

**Па-другое**, прызнана «экстрэмісцкімі матэрыяламі» прадмова да кнігі «Выбраныя творы. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч» і два вершы, якія прыпісваюцца

63 *https://nashaniva.com/321851*
64 *https://t.me/dw_belarus/9840*
65 *https://news.zerkalo.io/cellar/48209.html?utm_source=news.zerkalo.io&utm_medium=news-bottom-block&utm_campaign=relevant_news*
66 *https://news.zerkalo.io/life/53544.html?c*

гэтаму класіку беларускай літаратуры. У вершах таксама адлюстроўваецца тэма барацьбы з імперскай Расіяй.[67] Это **першы выпадак прызнання «экстрэмісцкімі матэрыяламі» класікі беларускай літаратуры.**

## РЭПРЭСІЎНЫЯ ПРАКТЫКІ Ў СУВЯЗІ З ВЫВУЧЭННЕМ ПОЛЬСКАЙ МОВЫ ЯК ЧАСТКА БАРАЦЬБЫ З АДТОКАМ АБІТУРЫЕНТАЎ З КРАІНЫ

У другім паўгоддзі 2023 г. улады сканцэнтраваліся на адукацыйных арганізацыях, якія аказваюць паслугі па навучанні польскай мове. Часта такія курсы пазіцыянуюцца як падрыхтоўка для паступлення ў польскія ВНУ і падрыхтоўка да атрымання «карты паляка».

У верасні стала вядома аб выпадку, калі цэнтру вывучэння замежных моў працягнулі ліцэнзію з умовай закрыцця курсаў польскай мовы, абгрунтоўваючы гэта тым, што «людзі з'язджаюць за мяжу».[68]

У кастрычніку Міністэрства адукацыі правяло праверкі курсаў польскай мовы ў Гродне і Мінску. Правяралі, ці не парушаецца закон «Аб рэкламе» згодна з якім для рэкламы вучобы за мяжой рэкламадавец павінен прайсці ўзгадненне ў МУС і Міністэрстве адукацыі.[69] У снежні праваахоўныя органы затрымалі і правялі ператрусы ў супрацоўнікаў і кіраўнікоў некалькіх школаў польскай мовы. Некаторых з іх прымусілі запісаць «пакаяныя відэа», з якіх вынікае, што адной з прэтэнзій з'яўляецца відавочна абсурдная прычына – «навучалі польскай мове».

Супрацоўнікі «нейкіх спецыяльных службаў» прапаноўвалі добраахвотна закрыць курсы (што ўладальнікі і збіраюцца зрабіць, бо супрацоўнікі не могуць працаваць пад такім ціскам). Таксама ва ўладальнікаў патрабавалі спісы ўсіх кліентаў школ.[70]

Такая практыка з'яўляецца праявай узмацняльнай тэндэнцыі антызаходніцтва і часткай агульнай палітыкі дзяржавы па рашэнні праблемы адтоку чалавечага капіталу з краіны праз уласныя адносіны да чалавека. Гэта ўяўляе сабой парушэнне сацыяльных і эканамічных правоў: правы на адукацыю, у тым ліку свабоды выбару яго форм і напрамкаў.

---

67 *https://www.dw.com/ru/ekstremist-duninmarcinkevic-za-cto-vlasti-mstat-klassiku/a-67533589*
68 *https://udf.name/news/society/261164-kursam-polskogo-jazyka-prishel-kapec.html*
69 *https://mostmedia.io/2023/10/19/proverki-kursov-polskogo-v-belarusi/*
70 *https://reform.by/siloviki-prishli-v-shkolu-polskogo-jazyka-polskipro; https://reform.by/po-trebovaniju-silovikov-zakryvajutsja-kursy-polskogo-jazyka-panprofesor; https://reform.by/direktor-kursov-polskogo-jazyka-rasskazal-ob-oblave-trebujut-spiski-vseh-klientov*

На фоне закрыцця дзяржаўных і прыватных школ з польскай мовай навучання і адмены на заканадаўчым узроўні магчымасці адкрываць школы з навучаннем на мове нацменшасцей, такая практыка з'яўляецца яшчэ і парушэннем правоў нацыянальных меншасцей, бо істотна абмяжоўвае іх магчымасці вывучаць родную мову ў краіне пражывання. Не кажучы ўжо пра адвольныя затрыманні і адсутнасць працэсуальных гарантый для супрацоўнікаў такіх школ/курсаў.

## УЗМАЦНЕННЕ РЭПРЭСІЎНЫХ ПРАКТЫК У СУВЯЗІ З ВЫБАРАМІ* - 2024

Выбары*-2024 у Беларусі[72] пачаліся ва ўмовах бесперапынных рэпрэсій, фактычнай адсутнасці свабоды выказвання меркавання, мірных сходаў і асацыяцый, у атмасферы татальнага страху і ў зачышчаным палітычным полі. Пасля поствыбарчага крызісу 2020 г. і канстытуцыйных зменаў 2022 г. адбыліся істотныя змены ў прававым рэгуляванні выбараў, якія стварылі яшчэ большую прастору для парушэння выбарчых правоў і стандартаў справядлівых выбараў.[73] Акрамя гэтага, пачатак выбарчай кампаніі справакаваў узмацненне рэпрэсій у дачыненні да людзей, якія праяўлялі актыўнасць падчас папярэдніх электаральных кампаній (у тым ліку былі назіральнікамі).

Беларускі Хельсінкскі Камітэт і праваабарончы цэнтр «Вясна» распачалі кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары» – экспертную місію па маніторынгу за Выбарамі*-2024.[74] На другую палову 2023 г. прыпаў шэраг этапаў выбарчай кампаніі, уключаючы фарміраванне акруговых і тэрытарыяльных выбарчых камісій. Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» канстатуюць адсутнасць якой-небудзь незалежнай ініцыятывы, што тлумачыцца агульнай атмасферай страху перад рэпрэсіямі, і поўны кантроль уладаў над працэсам фармавання выбарчых камісій і іх складам.[75]

---

71 *Тэрмін «выбары*» у дачыненні да выбарчай кампаніі 2024 г. выкарыстоўваецца з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключаючы свабоду слова, свабоду мірных сходаў і асацыяцый, права ўдзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабоду ад дыскрымінацыі, што цяпер у Беларусі практычна адсутнічае.*

72 *Выбары* у ніжнюю палату Парламента і мясцовыя саветы дэпутатаў.*

73 *Сітуацыя перад выбарамі*2024. Першая справаздача кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»:*

74 *https://belhelcom.org/sites/default/files/belarus_situaciya_pered_vyborami2024_pervyy_otchet_ru.pdf*
*Заява аб пачатку экспертнай місіі па назіранні за выбарамі* ў Беларусі 25 лютага 2024 года https://spring96.org/be/news/113382*

75 *Гл. падрабязней у Аналітычнай справаздачы аб фармаванні тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»: https://belhelcom.org/sites/default/files/farmavanne_kamisij2024_ru_1.pdf*

## УСПЛЁСК РЭПРЭСІЙ У ДАЧЫНЕННІ ДА ЛЮДЗЕЙ, ЗВЯЗАНЫХ З ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ СІЛАМІ

У лістападзе 2023 г. прайшлі масавыя ператрусы ў многіх сябраў Каардынацыйнай Рады і супрацоўнікаў Офіса Святланы Ціханоўскай (усе яны знаходзяцца за мяжой). Следчы камітэт заявіў аб тым, што па справе Каардынацыйнай рады ў якасці падазраваных прыцягнутыя звыш ста чалавек.[76] Вядома, што шмат у каго з іх арыштаваная маёмасць. Людзі абвінавачваюцца па 6 артыкулах Крымінальнага кодэкса, у тым ліку: здрада дзяржаве, змова ці іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады і іншае.[77]

76 *https://www.belta.by/society/view/sk-v-kachestve-podozrevaemyh-po-delu-koordinatsionnogo-soveta-privlecheny-svyshe-sta-lits-602201-2023/*

77 *https://www.svoboda.org/a/a-v-otvet-tishina-v-belarusi-idut-obyski-u-davno-uehavshih-aktivistov/32703450.html*

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ДАТЫЧАЦЬ СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

## МІЖНАРОДНАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ ТАВАРЫСТВАЎ ЧЫРВОНАГА КРЫЖА І ЧЫРВОНАГА ПАЎМЕСЯЦА СПЫНІЛА ЧЛЕНСТВА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

1 снежня стала вядома, што членства БТЧК у Міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца прыпыненае[78] з-за невыканання Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа рэкамендацыі Федэрацыі аб адстаўцы старшыні БТЧК Дзм. Шаўцова ў сувязі з парушэннем асноўных прынцыпаў Руху Чырвонага Крыжа і Паўмесяца, неналежным выкарыстаннем эмблемы, парушэннем палітыкі абароны добрасумленнасці нацыянальных таварыстваў[79]. У тым ліку з-за шматлікіх выказванняў Дзм.Шаўцова, якія падтрымліваюць незаконныя перамяшчэнні ўкраінскіх дзяцей з акупаваных тэрыторый, яго візіту ў Данецк і Луганск. Гэта азначае, што БТЧК губляе ўсе свае правы як член федэрацыі (у тым ліку на атрыманне фінансавання). Статус БТЧК можа быць адноўлены, як толькі будзе выкананае рашэнне аб адстаўцы Дзм.Шаўцова.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА**

**ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG

[78] *https://www.ifrc.org/article/statement-suspension-belarus-red-cross-member-ifrc*
[79] *https://www.ifrc.org/article/ifrc-releases-findings-belarus-red-cross-secretary-general-call-dismissal*